Вядучая рубрыкі Любоў ТУРМАСАВА, загадчык аддзела краязнаўства абласной бібліятэкі імя Я.Карскага

# Святло Максімавай зоркі

**У канцы мінулага года наша краіна ўрачыста адзначыла 120-гадовы юбілей самага маладога класіка беларускай літаратуры – Максіма Багдановіча. За кароткі час жыцця, усяго дваццаць пяць гадоў, праз магутнасць унікальнага таленту ён здолеў дасягнуць вяршынь пісьменніцкага майстэрства. Гарадзенцы ганарацца, што лёс гэтага літаратара знітаваны з нашым горадам.**




Пры жыцці паэта пабачыў свет толькі адзін зборнік вершаў **”Вянок”**. Напрыканцы мінулага года выйшла ўжо трэцяе факсімільнае выданне гэтага зборніка.

Сусветна прызнаны творчы геній Багдановіча як вытанчанага паэта, бліскучага празаіка, дасканалага крытыка, таленавітага перакладчыка, удумлівага гісторыка. Гісторыя літаратуры не ведае іншага прыкладу, каб паэт, які з дзяцінства разлучаны з родным краем, самастойна вывучыў мову продкаў, засвоіў іх мінулае, узняўся да класічных вышынь вершаскладання.




Беларускі фонд культуры ажыццявіў выданне трох вершаў: **“Пагоня”**, **“Слуцкія ткачыхі”**, **“Раманс”** на дзесяці мовах: беларускай, англійскай, балгарскай, латышскай, літоўскай, нямецкай, польскай, рускай, украінскай, французскай.

Мастацкае афармленне гэтых трох кніг варта паэтычнага генія Максіма Багдановіча. На маю думку, праца мастака Юрыя Хілько з’яўляецца шэдэўрам кніжнага аздаблення.




Максім Багдановіч як творчая асоба – фенаменальная з’ява. Амаль кожны яго твор уяўляе сабой гарманічнае спалучэнне пачуцця і думкі, натхнення і працы, ён моцна уздзейнічае на чытача. Сведчанне гэтага зборнік вершаў **“Выбранае”**, які выйшаў у сталічным выдавецтве “Харвест”. Выданне кішэннага фармату з шыкоўным мастацкім афармленнем годна падкрэслівае талент “паэта чыстай красы”.




У выдавецтве “Мастацкая літаратура” выдадзены чарговы том серыі “Жыццё знакамітых людзей Беларусі” пад назвай **“Максім Багдановіч. Пясняр чыстае красы”**. Сярод аўтараў – бацька Адам Багдановіч, гісторык Вацлаў Ластоўскі, дзеячка нацыянальна-вызваленчага руху Зоська Верас, пісьменнік Змітрок Бядуля, пісьменнік і літаратуразнавец Максім Гарэцкі, бібліёграф Ніна Ватацы ды іншыя. Вершы-прысвячэнні вядомых пісьменнікаў сплятаюць вянок гонару і пашаны Максіму Багдановічу.




Энцыклапедыя **“Максім Багдановіч”** - знакавая падзея ў гісторыі нацыянальнай культуры. Такога гонару ўдастойваліся толькі Янка Купала і Францыск Скарына. Энцыклапедыя – вынік развіцця багдановічазнаўства як навукі. Кніга змяшчае каля 2000 артыкулаў. Асаблівасць ў тым, што ў ў адным вялікім выданні можна знайсці адказы абсалютна на ўсе пытанні, якімі задаюцца даследчыкі творчасці Багдановіча. Упершыню апублікаваны невядомыя звесткі з жыцця пісьменніка, пра яго адносіны з роднымі і таварышамі.